**Тухта, В.** Спецкамандзіроўка / В. Тухта // Лепельскі край. – 2017. – 14 лют. – С. 2.

# СПЕЦКАМАНДЗІРОЎКА

*Канстанцін Гардзееў – адзін з тых, каму давялося «панюхаць пораху» ў Афганістане. На працягу двух гадоў, з 1986 па 1988, займаў пасаду начальніка медыцынскага пункта стралковага батальёна, які нёс службу на горных заставах паміж Гератам і Шындандам. Пра той перыяд ветэран успамінае неахвотна – вайна сама па сабе пакідае непрыемны адбітак на тых, хто там пабываў, каб яшчэ пра тое ўспажнаць. Лічыць, як і ўсе, хто трапіў «за рэчку», што займаўся руціннай армейскай працай. А медаль «За адвагу», кавалерам якой з'яўляецца, і ёсць падзяка за тую працу.*

Падчас нашай размовы, каб не варушыць у памяці непрыемныя ўспаміны, Канстанцін Іванавіч стараецца пераключыць увагу на іншы факт са сваёй ваеннай біяграфіі.

Подыхам цёплага, насычанага вільгаццю паветра ў жніўні 1978 года сустракаў далёкі В'етнам Канстанціна Гардзеева і яго таварышчаў на трапе самалёта. Пад выглядам цывільных грамадзянскіх спецыялістаў сельскай гаспадаркі болыш за сотню савецкіх ваеннаслужачых ступілі на зямлю гэтай азіяцкай краіны. Перад гэтым было некалькі месяцаў спецправеркі ў Саюзе і на працягу месяца – аладжванне падраздзяленняў і падрыхтоўка тэхнікі ў Мінску.

Да гэтага Канстанцін ужо некалькі гадоў служыў начальнікам аптэкі ў танкавым палку ў Бароўцы. Па разнарадцы мусілі накіраваць у спецкамандзіроўку медыцынскага спецыяліста. Чаму выбар паў менавіта на прапаршчыка Гардзеева? Паўплывала, відаць, тая акалічнасць, што ен быў камуністам.

Куды павінны былі накіравацца ваенспяцы, пераважна сувязісты, заставалася сакрэтам. Па колькасці і назве зробленых прышчэпак ад розных спецыфічных хвароб Канстанцін Іванавіч толькі здагадваўся, што адправяць яго кудысьці ў Азію. Не ведалі нічога нават і тады, калі два семдзесят шостыя «Ілы» набіралі разгон па ўзлётнай паласе ў Мачулішчах на ўсход. Тодькі незадоўга да прызямлення ў Ханоі ваенным спецыялістам аб'явілі, што яны знаходзяцца ў паветранай прасторы В'етнама.

* * *

Чатырнаццаць месяцаў Канстанцін Гардзееў служыў на вузле сувязі ў в'етнамскай сталіцы. У адрозненне ад іншых ваенных, меў вольны выхад у горад, свабодна перамяшчаўся на санітарнай машыне па ўсім В'етнаме. У той час абстаноўка ў краіне была больш-менш спакойнай. Мінула некалькі гадоў, як скончылася грамадзянская вайна, полымя якой віравала з 1959 года. Нягледзячы на гэта, савецкая ваенная прысутнасць у краіне захоўвалася, але афіцыйна нідзе не афішыравалася.

Кансганцін Іванавіч згадвае, што сакрэтнасць была ва ўсім. Ваенную форму насіць забаранялася, толькі цывільнае адзенне – пераважна шорты і кашулі. Сем'і так-сама не ведалі, дзе знаходзяцца іх родныя. Адзіным сродкам зносін былі пісьмы, якія адпраўлялі з Саюза на маскоўскі адрас палявой пошты. Усе лісты праглядваліся ваеннай цэнзурай, каб хоць якім чынам не прасачылася нічога лішняга. Ваенспяцы шукалі любую магчымасць, каб паведаміць на радзіму месца свайго знаходжання: у пісьмы клалі в'етнамскія грошы, нашыўкі. Аднак цэнзура была пільнай – нічога да адрасатаў не даходзіла.

Тым часам Канстанцін Гардзееў лічыўся ў штаце сваёй часці. Ніводнага слова пра тое, што быў у В’етнаме, не сказана ў асабістай справе. Спецкамандзіроўка – адзіны скупы запіс, які захаваўся ва ўліковай картцы члена КПСС. У сямейным архіве Гардзеева хоць і не шмат, але ёсць некалькі сведчанняў службы ва В’етнаме. Па-першае, Ганаровая грамата, падпісаная Старшынёй Савета Міністраў Фам Ван Донгом, і медаль Сяброўства, а таксама некалькі чорна-белых фотаздымкаў.

На развітанне Канстанцін Іванавіч з настальгіяй адзначае, што ніколькі не шкадуе пра гады, аддадзеныя службе ў войску. Тое быў хоць і складаны, але цікавы перыяд жыцця, кажа ветэран.

*Валерый* ***ТУХТА***